*Пролетарыі ўсіх краін, єднайцеся!*

# ПЕРАМОГА

ОРГАН АНТОПАЛЬСКАГА РК КП (б) Б І ВЫКАНКОМА РАЙСОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ.

№ 42 (56) Аўторак, 11 верасня 1945 г.

## Дастойна сустрэнем 17 верасня—дзень уз'еднання беларускага народа!

## ХУТКА І ЯКАСНА ПРАВЕСЦІ СЯЎБУ АЗІМЫХ

Радасныя дні перажывае савецкі народ. „Доблесная Чырвоная Армія сумесна з саюзнікамі ліквідавала апошні ачаг агрэсіі на Далёкім Усходзе. З гэтага часу мы можам лічыць нашу Айчыну пазбаўленай ад пагрозы нямецкага нашэсця на захадзе і японскага нашэсця на ўсходзе. Наступіў доўгачаканы мір для народаў усяго свету". (Сталін).

Гістарычная прамова правадыра, апавясціўшая савецкі народ аб завяршэнні другой міравой вайны, выклікала новы патрыятычны ўздым сярод працоўных.

Па прыкладу дамачэўцаў сяляне нашага раёна разгарнулі сацыялістычнае спаборніцтва за дастойную сустрэчу нацыянальнага беларускага свята—17 верасня. На мітынгах, прысвечаных перамозе над Японіяй, сяляне бяруць абавязацельствы —да вялікага свята беларускага народа поўнасцю разлічыцца з дзяржавай па збожжапастаўках, своечасова і якасна пасеяць азімыя.

На ўзятыя абавязацельствы сяляне адказваюць канкрэтнымі справамі. Многія вёскі, як Ямнік, Галік, Асіпавіцкага сельсовета, Рудзец—Гарадзецкага сельсовета і другія разлічыліся з дзяржавай па збожжапастаўках.

Спаборнічаючы за датэрміновае выкананне збожжапаставак, працаўнікі вёскі праяўляюць вялікія клопаты аб ураджаю будучага года. У Галоўчыцкім сельсовеце сяляне своечасова правялі падняцце папараў, а зараз праводзяць прадпасеўную апрацоўку параных палёў і сяўбу азімых. Сяўба азімых у поўным разгары ў Гарадзецкім, Асіпавіцкім і другіх сельсоветах.

Аднак, у некаторых сельсоветах (Худлінскі, Першамайскі і другіх) не прыдалі належнай увагі сяўбе азімых. Кіраўнікі гэтых сельсоветаў не спалучаюць хлебанарыхтоўкі з правядзеннем сяўбы, а прынялі метад кампанейшчыны.

Трэба заўсёды памятаць, што сяўба азімых культур не цярпіць адкладанняў. Жыта і пшаніца, якія сеюцца позна і ідуць у зіму неўзмацнеўшымі, пашкоджваюцца марозам, разрэджваюцца і даюць нізкі ўраджай. Пагэтаму патрэбна своечасова правесці азімую сяўбу.

Азімымі ў нашым раёне павінна быць засеяна 6.400 гектараў, што складае 38 працантаў усей пасеўнай плошчы. Задача адказная і да яе павінны аднесціся з усёй сур'ёзнасцю. Сельскія советы ў першую чаргу павінны праявіць клопаты аб чырвонаармейскіх сем'ях, дапамагчы ім у засеве азімага кліна.

Вялікую дапамогу ў сяўбе азімых павінна аказаць сялянам МТС. Конна-пракатны пункт павінен быць выкарыстан з максімальнай нагрузкай.

Справа чэсці працоўнага сялянства нашага раёна пасеяць азімыя культуры своечасова і высокаякасна, па добраапрацаванай і ўгноенай глебе, добрым насеннем,—гэтыме самым закласці моцны фундамент высокага ўраджаю будучага года.

### ЗАСЕЯНА 120 ГЕКТАРАЎ АЗІМЫХ

На палях Асіпавіцкага сельсовета разгарнулася сяўба азімых. П[illegible] сельсовету на 10 верасня засеяна звыш 120 гектараў жыта.

Уперадзе па сяўбе ідзе вёска Татарнавічы.

Гардзіевіч,
старшыня сельсовета.

### У ПЕРАДАВЫМ СЕЛЬСОВЕЦЕ

Прамова правадыра таварыша Сталіна, прысвечаная перамозе над Японіяй, выклікала новы ўздым у вёсцы. Па прыкладу сялян Дамачэўскага раёна сяляне Дзеткаўскага сельсовета рашылі да 17 верасня—нацыянальнага беларускага свята поўнасцю разлічыцца з дзяржавай па збожжапастаўках.

Словы не разыходзяцца з справай. На 9 верасня сяляне сельсовета здалі 52 тоны збожжа дзяржаве.

Выканаўшы план пастаўкі збожжа дзяржаве, сяляне здаюць хлеб у фонд Чырвонай Арміі. Так, Каралюк Васілій з вёскі Менеўеж здаў 80 кілограм, Галуц Марк—88 кілограм, жонка чырвонаармейца Анна Даўгун з вёскі Залессе —77 кг. і другія.

Усяго па сельсовету здана ў фонд Чырвонай Арміі 11 тон хлеба.

І. Шкроб.

### НАСУСТРАЧ ВЯЛІКАМУ СВЯТУ

Рыхтуючы дастойную сустрэчу 17 верасня—дню ўз'еднання беларускага народа ў адзіную дзяржаву сяляне Першамайскага сельсовета ўзмацняюць тэмпы малакапаставак дзяржаве. На 1 верасня па сельсовету план малакапаставак выканан на 91,5 працэнтаў.

### ВЫСОКАЯ ВЫПРАЦОЎКА

Навышэннем вытворчасці працы адказваюць на гістарычную прамову правадыра рабочыя райпромкамбіната. Рабочы ганчарнай майстэрні т. Іванец сістэматычна перавыконвае норму выпрацоўкі, а ў гэтыя дні ён выконвае норму на 200 працантаў. На 150 працантаў далі выпрацоўкі кавалі Бортнік і Агіцкі.

## ФАРСІРАВАЦЬ ТЭМПЫ ХЛЕБАПАСТАВАК.

Натхнёныя вялікай перамогай над японскай агрэсіяй сяляне нашага раёна прыкладваюць усе намаганні к таму, каб датэрмінова разлічыцца з дзяржавай па збожжапастаўках, даць больш хлеба краіне для хутчэйшага залячэння ран, нанесеных вайной.

Следуючы прыкладу дамачэўскіх сялян, многія вёскі нашага раёна, як Ямнік, Асіпавіцкага сельсовета, Рудзец, Гарадзецкага сельсовета, рыхтуючы дастойную сустрэчу 17 верасня—дню ўз'еднаня беларускага народа у адзіную дзяржаву, поўнасцю разлічыліся з дзяржавай па збожжапастаўках. Добрыя паказчыкі маюць у выкананні плана хлебапаставак Дзеткаўскі, Акцябрскі, Антопальскі і другія сельсоветы.

Аднак, ёсць сельсоветы, як Дзераўноўскі (старшыня т. Грыб), Каменскі (старшыня т. Антанюк), якія заўсёды плятуцца ў хвасце на збожжапастаўках. За апошнія дні зусім знізіў тэмпы здачы хлеба і Гарадзецкі сельсовет. Гэтыя сельсоветы па збожжапастаўках цягнуць назад увесь раён.

Галоўнымі прычынамі адставання гэтых сельсоветаў з'яўляецца тое, што тут слаба разгорнута масава-палітычная работа сярод сялян. Насельніцтву не растлумачана яшчэ пастанова Соўнаркома СССР і ЦК ВКП(б) аб уборны ўраджаю і нарыхтоўцы сельскагаспадарчых прадуктаў, да сялян не давездзен зварот дамачэўцаў аб датэрміновым выкананні хлебапаставак. У выніку чаго сярод сялян слаба арганізавана соцыялістычнае спаборніцтва.

Усе гэтыя недахопы неабходна выправіць. Гарадзецкі, а таксама і ўсе адстаючыя сельсоветы маюць усе магчымасці своечасова здаць збожжа дзяржаве.

### ЗВОДКА
**аб ходзе збожжанарыхтовак па раёну на 10 верасня.**

| №№ п/п | Назва сельсоветаў | Процант выканання |
|---|---|---|
| 1 | Дзеткаўскі | 70,4 |
| 2 | Акцябрскі | 67,6 |
| 3 | Антопальскі | 52,4 |
| 4 | Худлінскі | 51,3 |
| 5 | Дзямідавіцкі | 50,8 |
| 6 | Першамайскі | 49,5 |
| 7 | Галоўчыцкі | 49,4 |
| 8 | Асіпавіцкі | 48,2 |
| 9 | Заніўеўскі | 47,2 |
| 10 | Аніскавіцкі | 46,3 |
| 11 | Гарадзецкі | 46,0 |
| 12 | Ілаўскі | 44,7 |
| 13 | Каменскі | 36,5 |
| 14 | Дзераўноўскі | 33,2 |
| | Па раёну: | 50,5 |



Калгас імені Будзённага, Цэлінскага раёна Растоўскай вобласці, разгортвае вялікую работу па аднаўленню гаспадарчых будынкаў, разбураных нямецкімі захопнікамі. Для гэтага калгаснікі самі вышукваюць будаўнічы матэрыял.

На здымку: калгасная брыгада за выраблением саманнай цэглы.

Фото І. Дыніна

Фотахроніка ТАСС.

## Больш увагі цагельным прадпрыемствам

У адпаведнасці з рашэннемі VI пленума ЦК КП (б) Б аб арганізацыі масавай вытворчасці цэглы, чарапіцы і другіх будаўнічых матэрыялаў, у нашым раёне намечана пабудаваць два цагельных заводы: адзін—па лініі райпромкамбіната, другі—па лініі міогапромсаюза.

Новыя будоўлі неабходна забяспечыць значнай колькасцю цэглы, вапны, лесаматэрыяла. У раёне маецца два цагельных заводы. Яны і павінны забяспечыць будоўлі матэрыяламі. Аднак, гэтыя заводы працуюць крайне нездавальняючы. Гадавы план вырабу цэглы знаходзіцца пад пагрозай зрыва. На 10 верасня план па фармоўцы цэглы выканан усяго на 28 процантаў, абпалу на 25 процантаў.

У чым прычына невыканання плана?

Перш за ўсё неабходна адзначыць, што ў нашым раёне цагельным заводам прыдавалася мала ўвагі. На цагельным заводзе, які знаходзіцца ў Першамайскім сельсовеце, патрэбна было пабудаваць навес, але апошні не накрыт. Рабочым і зараз прыходзіцца работаць пад адкрытым небам. Заводы зусім не забяспечаны дравамі. Выканком Райсовета дэпутатаў працоўных некалькі разоў выносіў рашэнні, у якіх абавязваў Першамайскі, Заніўеўскі, Дзераўноўскі сельсоветы вывезці на 33 кубаметры лесаматэрыяла і дроў на цагельныя заводы, але кіраўнікі сельсоветаў сталі на шлях ігнарыравання рашэнняў і да гэтага часу дроў і лесаматэрыялу не вывезлі.

На заводах для рабочых не створаны ўмовы працы. З імі не праводзіцца масава-палітычная работа, няма дошкі перадавікоў.

Усе гэтыя недахопы неабходна неадкладна выправіць. План вырабу цэглы павінен быць выканан.

**Пятроў.**

В. а. рэдактара
П. СПІРЫДОНАЎ.

ГЛ 14663 Адрас рэдакцыі: г. Антопаль, Савецкая вуліца, дом № 2.